УДК 659.4(091)

# ПРАТАФОРМЫ ІНФАРМАЦЫЙНА-КАМУНІКАЦЫЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ПАДЧАС КНЯЖАННЯ ВІТАЎТА (другая палова XIV – пачатак XV ст.)

*І. Д. ВОЮШ*[1*]

[1*]*Інстытут журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

Разглядаюцца формы інфармацыйна-камунікацыйнай дзейнасці на мяжы XIV–XV стст. на тэрыторыі Беларусі і іх верагодная суадноснасць з сучаснымі практыкамі сувязей з грамадскасцю. Аналізуюцца спосабы надання сацыяльна значнага зместу дзейнасці князя Вітаўта і яго асобе падчас княжання, ажыццяўленне дваром Вялікага Княства Літоўскага ўнутры- і знешнепалітычных кантактаў, а таксама пазіцыянаванне першай асобы дзяржавы праз знешнюю атрыбутыку гаспадарскага двара.

***Ключавыя словы:*** гісторыя сацыяльнай камунікацыі; сувязі з грамадскасцю; Вялікае Княства Літоўскае; вялікі князь Вітаўт.

# ПРОТОФОРМЫ ИНФОРМАЦИОННО-КОММУНИКАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ВО ВРЕМЯ КНЯЖЕНИЯ ВИТОВТА (вторая половина XIV – начало XV в.)

*И. Д. ВОЮШ*[1)]

[1)]*Институт журналистики Белорусского государственного университета, ул. Кальварийская, 9, 220004, г. Минск, Республика Беларусь*

Рассматриваются формы информационно-коммуникационной деятельности на рубеже XIV–XV вв. на территории Беларуси и их вероятная соотнесенность с современными практиками связей с общественностью. Анализируются

**Образец цитирования:**
Воюш І. Д. Пратаформы інфармацыйна-камунікацыйнай дзейнасці падчас княжання Вітаўта (другая палова XIV – пачатак XV ст.) // Журн. Белорус. гос. ун-та. Журналистика. Педагогика. 2017. № 1. С. 4–13.

**For citation:**
Voyush I. D. Protoforms of information and communication activities during the reign of Vytautas (the second half of the XIV – early XV century). *J. Belarus. State Univ. Journalism. Pedagog.* 2017. No. 1. P. 4–13 (in Belarus.).

**Автор:**
***Инга Дмитриевна Воюш*** – кандидат филологических наук, доцент; доцент кафедры истории журналистики и менеджмента СМИ.

**Author:**
***Inha Voyush***, PhD (philology), docent; associate professor at the department of journalism history and media management.
*vojush@rambler.ru*

способы придания социально значимого содержания деятельности князя Витовта и его личности во время княжения, осуществление двором Великого княжества Литовского внутри- и внешнеполитических контактов, а также позиционирование первого лица государства через внешнюю атрибутику княжеского двора.

***Ключевые слова:*** история социальной коммуникации; связи с общественностью; Великое княжество Литовское; великий князь Витовт.

# PROTOFORMS OF INFORMATION AND COMMUNICATION ACTIVITIES DURING THE REIGN OF VYTAUTAS (the second half of the XIV – early XV century)

***I. D. VOYUSH***[a]

[a]*The Institute of Journalism of the Belarusian State University, Kal'variiskaya street, 9, 220004, Minsk, Republic of Belarus*

The form of information and communication activities at the turn of the XIV and XV centuries on the territory of Belarus and their probable correlation with the modern practice of public relations are considered. The ways of giving socially significant content to Duke Vytautas activities and his identity during the reign, the exercise of internal and external contacts by the Grand Duchy of Lithuania are analysed as well as the positioning of the top person of the state through the external attributes of the princely court.

***Key words:*** history of social communication; public relations; Grand Duchy of Lithuania; Vytautas the Great.

Адным з запатрабаваных сёння высокаінтэлектуальных відаў дзейнасці ў соцыуме з'яўляецца арганізацыя сувязей з грамадскасцю. З гэтай прычыны становіцца актуальным даследаванне *public relations* як сацыякультурнай з'явы. Тэорыю і практыку сучаснай інфармацыйна-камунікацыйнай дзейнасці, уключаючы гісторыю яе развіцця ў XIX–XXI стст., плённа даследуюць прадстаўнікі кафедры тэхналогій камунікацыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта І. Сідорская, А. Салаўёў, П. Салаўёў, Л. Савіцкая, А. Каспяровіч, Р. Касціцын, Г. Кузьмянкова. У гістарыяграфіі склалася традыцыя адрозніваць *public relations* (PR) як самастойную сацыяльна-камунікатыўную практыку, што склалася ў ЗША цягам XIX–XX стст., і іх пратаформы як з'яву, што папярэднічала інстытуцыялізацыі і натуральна абумоўлівала іх фарміраванне.

Ніша, у якой палягае аналіз даінстытуцыяльнага перыяду зараджэння грамадскіх камунікацый, дагэтуль застаецца незакрытай. Найменш запоўнены ў ёй два сегменты:

1) выпрацоўкі адэкватных метадалагічных падыходаў у даследаванні феноменаў сацыяльнай камунікацыі;

2) сістэматычнай дэскрыпцыі айчыннага гістарычнага вопыту.

У метадалагічным сэнсе важна вызначыцца з намінацыяй названага перыяду. Даследчык гістарыяграфіі PR І. Кужалева-Саган размяжоўвае паняцці «перадгісторыя», якое адносіцца да найбольш старажытных праяў грамадскай камунікацыі, і «гісторыя», звязанае са станаўленнем PR у сучасным разуменні [1]. І. Сядзельнікаў прапануе па аналогіі са сталым найменнем «пратарэклама» абазначаць з'явы даінстытуцыяльнай эпохі як «пратапіяр» – «запланаваныя працяглыя намаганні, накіраваныя на стварэнне і падтрыманне пэўнага аблічча гістарычнай асобы або падзеі ў вачах сучаснікаў або нашчадкаў» [2, с. 191–192]. Разумеючы, што кадыфікацыя гэтага тэрміна яшчэ наперадзе, будзем пры неабходнасці выкарыстоўваць лексему «перадгісторыя», а для абазначэння форм пратапіярыстычнай дзейнасці – паняцце «пратаформа».

У шэрагу стратэгічных задач беларускай гістарыяграфіі PR – стварэнне несупярэчлівай мадэлі развіцця айчынных сувязей з грамадскасцю XXI ст. і паэтапная рэканструкцыя папярэдніх, пачынаючы з самых старажытных, практык сацыяльнай камунікацыі. У гэтым рэчышчы зробім спробу асэнсаваць у межах дыскурснага падыходу сацыяльныя камунікацыйныя практыкі, якія выкарыстоўваліся на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага падчас княжання Вітаўта і асацыяваліся з яго асобай.

Вызначым аб'ектыўныя абмежаванні ў правядзенні даследавання, якія могуць ускосна паўплываць на валіднасць вынікаў. З боку вывучэння крыніц гэта:

1) аддаленасць у часе разглядаемай эпохі, немагчымасць непасрэднага назірання над камунікатыўнымі працэсамі і іх ацэнкі;

2) апасродкаванае вывучэнне летапісных крыніц – паводле пазнейшых спісаў з аўтэнтыкаў;

3) абмежаваны спектр каналаў старажытнай камунікацыі – вусная (прамовы, чуткі, легенды,

зносіны ў рамках дыпламатычнага пратакола), дакументная (летапісы, гандлёвыя дамовы, заканадаўчыя акты), прадметна-мастацкая (манеты, пячаткі, касцюм, скульптура, архітэктура).

З боку метадалогіі гэта:

1) немагчымасць прымянення сучасных метадаў аналізу грамадскай думкі;

2) адсутнасць выпрацаваных агульных падыходаў да вывучэння феноменаў айчыннай перадгісторыі PR.

Найбольш дакладна пазіцыянаванне першай асобы дзяржавы праяўляецца ва ўсталяванні статуснаролевых узроўняў. Яны фарміруюцца шляхам надання сацыяльна значнага зместу асобе і дзейнасці вялікага князя, правядзення дзяржаўнай палітыкі з дапамогай камунікатыўна-сацыяльных практык, а таксама знешняй атрыбутыкі гаспадарскага двара.

Наданне сацыяльна значнага зместу асобе і дзейнасці Вітаўта суправаджалася пэўнай міфалагізацыяй вобраза вялікага князя і пры яго ўладзе, і – асабліва – пасля. Адбывалася гэта, зразумела, не праз запланаваныя захады яго канцылярыі, а праз традыцыйна сфарміраванае стаўленне насельніцтва да вобраза ўладара, яго слаўных продкаў. А. Шаланда ў энцыклапедычным артыкуле, прысвечаным маці Вітаўта Біруце, указвае, што тая належала да дробнага баярскага або нават простага люду. Пры гэтым рускія летапісы, «Хроніка Быхаўца» і «Аповесць пра рыцарскія справы і ўчынкі Вітаўта Вялікага» сведчаць пра «няпростае» паходжанне маці князя – язычніцкай жрыцы: «Бірута паклялася сваім багам ніколі не выходзіць замуж, захоўваць чысціню праз усё жыццё. Простыя людзі лічылі яе багіняй» [3, с. 250]. Гэта акалічнасць надавала ў вачах нашчадкаў, а магчыма, і сучаснікаў рысы абранасці і самому Вітаўту, апраўдвала яго правы на літоўскі сталец.

Падобная лінія прасочваецца ў «Смаленскім этнаграфічным зборніку», звесткі з якога ў 2011 г. уведзены ў навуковы ўжытак З. Скварчэўскім. Так, натуральнае права Вітаўта на шанаванне абгрунтоўваецца звычайным для міфалогіі індаеўрапейскіх народаў спосабам – праз абранне свяшчэннай кабыліцай. Паводле старажытнага падання пасля спачыну польскага караля «начальства» экіпіравала яго кабыліцу і стала віжаваць, каго тая абярэ за ездака. Змовіліся, што гэтага чалавека прызнаюць каралём. Кабыліца ўкленчыла перад старым, што «за авінам вяроўкі віў», таму і прызваны кароль быў Вітаўтам. Відавочны пазнейшыя напластаванні на архаічны міф, але, як бачым, ён трывала зліты ў народнай свядомасці з вобразам вялікага князя [4].

У працяг паказанага сюжэта з’яўляецца новы – пра Вітаўта, які, пасмяротна застаўшыся абаронцам Айчыны, дае запавет: «Ну, еслі хто вас абідзіць, Польшу, вазміце музыку і зайграйце над магілаю маёю: я ўстану і памагу вам» [4]. Усё пералічанае – ускоснае сведчанне трываласці іміджу Вітаўта як заваёўніка і абаронцы, аб’яднальніка Літвы, якое не магло ўзнікнуць беспадстаўна.

Такі працяглы эфект, верагодна, быў дасягнуты дзякуючы моцнай цэнтралізацыі ўлады, пэўнай яе «замкнёнасці» на адной асобе, памнажэнню колькасці лаяльных васалаў. Згадаем практыку намесніцтва, якая актыўна ўжывалася Вітаўтам у адрозненне ад папярэдняй выбарнай. Утрыманне гэтай лаяльнасці сталася магчымым акурат праз актыўную заваёўніцкую дзейнасць, падначаленне сумежных тэрыторый, абарончыя выступленні супраць арды. Вядома, што Вітаўт лічыўся не толькі моцным, але і шчодрым гаспадаром, бо не самыя багатыя ўдзельнікі яго паходаў масава атрымлівалі зямельныя надзелы, чым падвышалі свой уласны статус. Ваенна-служылае саслоўе магло не падтрымліваць пэўныя захады свайго князя, але павінна было дэманстраваць лаяльнасць, каб захаваць умоўна належныя землі і правы.

Другім істотным складнікам вобраза Вітаўта-кіраўніка, што меў дачыненне да камунікатыўных грамадскіх практык, сталі адносіны да рэлігійнага пытання. Трэба агаварыцца, што палітыка вялікага князя ў гэтым напрамку вылучалася паспешлівасцю і некаторай дэзарыентаванасцю, чаго вымагалі зменлівыя абставіны. Ды і сам Вітаўт, як вядома, неаднаразова пераходзіў з адной веры ў другую, што падрывала яго аўтарытэт у асобных грамадскіх колах.

У час язычніцтва папулярнасці вялікага гаспадара, несумненна, спрыяла высылка хрысціянскіх місіянераў, якія дзейнічалі даволі прымітыўна – знішчалі паганскія артэфакты, падманам вызнавалі месцы капішч. Зразумела, іх дзейнасць не была ўхвалена мясцовым насельніцтвам. З мэтай заспакаення народа вялікі князь Вітаўт скасаваў загад наменікам ваяводстваў дапамагаць місіянерам і выслаў іх за межы княства.

Энэй Сільвій Пікаламіні ў нататках «Пра Літву» (XV ст.) паказвае пярэсты канфесійны склад насельніцтва ВКЛ. Так, паводле К. Шэлегавай, ён у сваіх запісах падзяляе ўсіх ліцвінаў на некалькі груп у залежнасці ад веры, якую яны вызнавалі: першая – «прытрымліваюцца памылак грэкаў», другая – паганцы, што «блукаюць у цемры, укленчваючы перад ідаламі», трэцяя – хто «прыведзен да Хрыста». Аўтар верыць, што «евангельле Хрыста прыйдзе і да князя Вітаўта, у Літву» [5, с. 26–27].

Падрабязна аналізуе ўплывы кожнай з канфесій на настроі літоўскага грамадства пры Вітаўце Ю. Мікульскі ў артыкуле «Князь Вітаўт вачыма нашых продкаў. Стаўленне рускага насельніцтва ВКЛ да літоўскага гаспадара», спасылаючыся на аўтарытэтныя крыніцы – даследаванні Р. Пятраўскаса, М. Трайдаса, М. Прыселкова, М. Ледке, літоўскія метрыкі, звод рускіх летапісаў.

Гады, калі Вітаўт прыняў каталіцтва, а затым праваслаўе і вярнуўся ў лона касцёла (1383; 1384; 1386), прадвызначылі заўважаную намі няпэўнасць яго пазіцыі ў дачыненні да названых канфесій. Гэта выклікала незадаволенасць у праваслаўных колах і, у спалучэнні з мясцовымі прымхамі і вераваннямі, інсціравала адмоўныя канатацыі ў ацэнцы князя. Пра настроі беларускага грамадства ў той час добра сведчыць такі факт, што пасля Крэўскай уніі (1385) тут актыўна распаўсюджвалася антылацінская літаратура [6]. Атмасфера тых часоў адлюстравана і ў летапісе Аўраамкі, дзе чытаем, што пасля пераходу ў каталіцтва Вітаўт увогуле перастаў быць хрысціянінам: «…былъ князь Витовтъ христьянин, а имя емоу Александръ, и отвержеся православнои вере, хрестьяньства, и приатъ латыньскую веру». Тамсама летапісец адзначае, што татар на Кіеў у 1399 г. навяло менавіта адступленне Вітаўта ад «хрысціянскай» веры [6].

Яго далейшая дзейнасць, у прыватнасці падпісанне Віленска-Радамскай (1401) і Гарадзельскай (1413) уній, прывяла да таго, што асобам некаталіцкага веравызнання было складана трапіць у княжацкі двор. З прычыны кардынальных перамен у прыхільнасцях вялікага князя сітуацыя ў краіне накалялася, яго «паблісіці» і нават улада падвяргаліся грамадскай крытыцы. Вітаўт структураваў двор паводле ўзораў заходнееўрапейскіх краін, дзе вядучую ролю адыгрываў касцёл. Гэта спарадзіла наданне апошняму земляў, а ліцвінам-каталікам пасад, што не спрыяла развіццю праваслаўнай царквы. М. Ледке згадвае спецыяльныя эдыкты Вітаўта і Ягайлы, якія ўводзілі забарону на будаўніцтва праваслаўных храмаў на тэрыторыі Літвы [6]. Таксама Літоўская метрыка захавала звесткі пра адабранне князем царкоўных маёнткаў. За нешта Вітаўт «розгневався» на смаленскага ўладыку і адабраў у кафедры сяло, даўшы яго ў дзяржанне аднаму баярыну. Тое ж «по хотению» Вітаўта сталася з кіеўскім мітрапалітам Фоцієм і яго ўладаннямі [6].

Калі да 1415 г. была ўстаноўлена аўтакефальная Літоўска-Кіеўская мітраполія, яе ўзначаліў валашска-балгарскі асветнік Рыгор Цамблак (Сіміўлак). Дарэчы, так і не прызнаны Канстанцінопалем, нягледзячы на неаднаразовыя звароты Вітаўта да патрыярха. Адмоўныя рэфлексіі выклікала і іншавер'е самога вялікага князя. У акружным пасланні названага вышэй года Вітаўт згадваў, што многія людзі вінавацяць яго ў «аскудзенні» царквы: «…хотя есмо не у вашеи вере, а иныи люди съ стороны ркуть: "осподарь не въ той вере, того для Церковь оскудела, ино бы того слова отъ людеи на насъ не было"» [6]. Мітрапаліт Цамблак, як падае рускае летапісанне, пытаўся ў Вітаўта: «Дзеля чего ж ты, княжа, сам у веры ляцкай, а не ў праваслаўнай веры хрысціянскай?» [6].

Вынікам адсутнасці міжканфесійнай камунікацыі з уладнымі структурамі стала настолькі адмоўнае ўспрыманне кіраўніка Літоўскай дзяржавы, што калі Вітаўт памёр, многія, асабліва русіны, радаваліся і звязвалі свае надзеі з князем Свідрыгайлам, які спавядаў праваслаўе [6].

Важнай крыніцай разумення камунікацыйных працэсаў у атачэнні Вітаўта (і пры яго жыцці, і пасля) з'яўляюцца летапісы. Разгледзім, якім чынам рэпрэзентавалася постаць вялікага князя ў летапіснай традыцыі. Паказальнымі ў гэтым плане з'яўляюцца «Летапіс княжання Вітаўта», «Сказанне пра бітву на Ворскле», «Аповесць пра рыцарскія справы і ўчынкі Вітаўта Вялікага», «Аповесць пра Падольскую зямлю» і «Пахвала вялікаму князю Вітаўту».

Свецкі помнік «Летапіс княжання Вітаўта» ахоплівае перыяд 1390–1430 гг. Медыявіст І. Саверчанка піша пра ўспрыманне сучаснікамі літоўскага гаспадара: «Ён [Вітаўт] падаецца пісьменнікам як аўтарытэтны палітычны лідар, энергічны стваральнік моцнай дзяржавы, што нязменна прагнуў пашырэння сваіх уладанняў… Ён пастаянна трымае сваіх ворагаў у страху, прымушае падначаленых безагаворачна выконваць яго загады» [3, с. 240]. Пры гэтым шляхі атрымання высокага ўладнага статусу і здабывання тэрыторый падаюцца ў летапісе надзвычай праўдзіва. Так, паабяцаўшы князю Глебу Святаслававічу мірны справядлівы суд з яго братамі («Калі разгарыцца спрэчка ў вас, я буду трэці, хто справядліва рассудзіць вас»), Вітаўт падманам «узяў у палон смаленскіх князёў», пазней «забраў пад сваю ўладу ўсё Смаленскае княства» [3, с. 240]. А калі восенню 1395 г. Вітаўт не змог заняць Смаленск і вымушана падпісаў замірэнне, летапісец тлумачыў гэта паморкам, які здарыўся ў горадзе пасля адыходу княжых войскаў. Звязваў божае наканаванне і перамогі васалаў Вітаўта аўтар хронікі і ў запісе пад 1402 г., калі літоўскія князі разбілі разанскія палкі: «…у сакавіку, падчас вялікага гавення, назіралася незвычайнае дзіва на нябёсах. На вячэрняй зорцы на захадзе з'явілася велізарная планета. Уверх ад яе зыходзіў яркі промень. Планета ўзыходзіла на ўсходзе і асабліва разгаралася на летнім захадзе. Назіралі яе на працягу ўсяго вялікага гавення і ў вялікую пятніцу». Менавіта падчас той адзнакі літоўскія князі «ўзялі ў палон князя Радзіслава і прымусова прывезлі яго да вялікага князя Вітаўта» [3, с. 241]. Нескароным жа князям Вітаўт не даруе: адных трымае ў вязніцы, іншых катуе. Прычым жорсткасць вялікага гаспадара тут хутчэй разглядаецца як праява сілы, а не як благая рыса.

Ёсць звесткі ў «Летапісе княжання Вітаўта» і пра час напярэдадні каранацыі. Яны пададзены зноў жа ў выглядзе фальклорнай формулы, якая міфалагізуе вобраз гаспадара. Запрошаныя на ўрачыстасці каралі і вялікія князі «жылі ў Вітаўта 7 тыдняў <…> Кожны дзень яны выпівалі трыста бочак мёду, з'ядалі трыста ялавіц, трыста бараноў і трыста

вепрукоў» [3, с. 243]. Ускосна размах святкаванняў, уласцівы Вітаўту, пацвярджаецца А. Войнічам у крыніцы «Луцк на Валыні» (1922, на пол. мове), калі той распавядае пра з'езд еўрапейскіх манархаў у Луцку: «Штодня спажывалася 700 бочак мёду, віна, мальвазіі і іншых напояў, 700 валоў, 1400 бараноў, сотні ласёў, дзікоў, а таксама іншыя стравы». Падобная форма дэманстрацыі магутнасці была ўласціва многім заходнім каронам.

Вельмі ярка паказана стаўленне аўтара да авантуры, што прывяла войскі Вітаўта да зруйнавальнага паражэння, у «Сказанні пра бітву на Ворскле». Летапісец асуджае амбітнасць вялікага князя, жаданне падпарадкаваць сабе не толькі рускія землі, але і «астатні свет», як зазначае ў каментарыі да помніка І. Саверчанка [3, с. 245]. Не выключана, што гэтае паражэнне каштавала вялікаму князю страты не толькі многіх харугваў і зброі, але і шматлікага корпуса прыхільнікаў, а па вялікім рахунку – аўтарытэту сярод літоўска-беларускай эліты.

Аўтар «Аповесці пра рыцарскія справы і ўчынкі Вітаўта Вялікага», магчыма, належаў да атачэння князя. Яго інтэрпрэтацыя відавочна станоўчая, заўважаецца шчыльны адбор фактаў на карысць князя. Напрыклад, ён з разуменнем ставіцца да звароту вялікага князя да крыжакоў, апускае факт уцёкаў Вітаўта ў жаночым адзенні, затое дапускае абразлівыя выразы ў дачыненні яго палітычнага апанента Скіргайлы.

Паводле «Аповесці...» Вітаўт паводзіць сябе высакародна, праяўляе знаходлівасць пры нападзе Ягайлы на Гародню. Разам з прускімі крыжакамі ён пачаў узводзіць замак, а бачачы, што не паспявае, «загадаў працягнуць доўгі жалезны ланцуг цераз Нёман да Верхняга замка, каб даставіць абаронцам горада падмогу і харчаванне, забраць параненых і хворых» [3, с. 254]. Ідэя абярнулася няшчасцем – людзі пры пераправе патапіліся, збітыя каралеўскімі войскамі, але высакароднасць вялікага князя была засведчана.

Апяваецца ўплывовасць Вітаўтавай асобы ў сюжэце пра «пскавян», якія, убачыўшы, што ім не перамагчы суседа, «дабравольна здаліся Вітаўту» і пагадзіліся плаціць «штогадовы голд (падатак. – *І. В.)*: ...пяць тысяч чырвоных залатых; некалькі дзясяткаў нямецкіх фрызаў, ...50 футраў; па сорак скур розных звяроў – ваўкоў, мядзведзяў, рысяў, ліс, сабалёў, кунаў, белак і гарнастаяў» [3, с. 271].

Супярэчліва выглядае характарыстыка вялікага князя падчас бітвы на рацэ Ворскле. Вось што занатавана ў летапісе: «Вітаўт перад вырашальнай бітвай звярнуўся да жаўнераў з узнёслай прамовай: – Бачу вашу рыцарскую адвагу, смеласць і рашучасць ісці ў бой! Няхай вашы мужныя сэрцы выявяць адвагу, а я буду з вамі!». А калі ўгледзеў небяспеку, то, «скарыстаўшы адмысловы манеўр, уцёк з Свідрыгайлам і малой дружынай» [5, с. 265]. У гэтым учынку мала гераічнага, але ён захаваў жыццё гаспадару, і таму падобны крок можа інтэрпрэтавацца як нейтральны, непазбежны.

Напярэдадні каранацыі 1430 г. смаленскім епіскапам Герасімам быў створаны помнік «Пахвала вялікаму князю Вітаўту», які маніфеставаў яго ідэалізаваны вобраз. Тэкст мае некаторыя ўнікальныя адметнасці. Напрыклад, уласцівыя панегірычнаму жанру эпітэты кшталту *міласцівы* і *хрысталюбны* не стасаваліся да асобы ваяўнічага і амбітнага князя і былі апушчаны аўтарам у парушэнне канона [6]. Затое сінтаксіс і выяўленчыя сродкі як найлепш адпавядаюць жанру: «Няма земляў ні на ўсходзе, ні на захадзе, адкуль не прыходзілі б пакланіцца гэтаму слаўнаму гаспадару. Калі нават ёсць цар над усёю зямлёю, і той, прыйшоўшы, кланяўся... Аляксандру, яшчэ званаму Вітаўтам». Запісы ў «Аповесці...» і «Пахвале...» стасуюцца з сучаснай тэндэнцыяй PR-хадоў, апісаных піянерам сувязей з грамадскасцю Э. Бернэйзам: выпячваннем станоўчых якасцей аб'екта і далікатным абыходжаннем з нестаноўчымі.

Звернемся да сацыяльных практык пры княжанні Вітаўта і іх сувязі з інфармацыйнымі плынямі ў грамадстве.

Як ужо адзначалася, Вітаўт фарміраваў двор у адпаведнасці з заходнімі ўзорамі. Паводле Р. Пятраўскаса, Вітаўт арганізаваў корпус княжых дарадцаў, што жылі пры двары і займаліся канцылярскімі клопатамі. Даследчыкам згадваюцца Манівід, Сунгайла, Чупурна і Мінігайла. Трэба сказаць, што дарадцы аказвалі дастаткова моцнае ўздзеянне на вялікага князя, бо былі дасведчанымі і займалі высокае палажэнне ў грамадстве [7]. Па запісах Доўнар-Запольскага, яны ўплывалі на князя, напрыклад, у вырашэнні пытанняў гандлёвых стасункаў з суседнімі дзяржавамі [6]. Пасады намеснікаў у рускіх землях раздаваліся пераважна людзям з блізкага атачэння Вітаўта, хоць часам сустракаліся намеснікі з мясцовых рускіх эліт [7]. Дзейнасць дарадцы сёння можна суаднесці з дзейнасцю спікера або спічрайтара.

Своеасаблівым рупарам меркавання эліт, ды і княжацкай думкі, пры Вітаўце выступаў блазан Генэ, які – праз сваю выведвальную дзейнасць на карысць Жыгімонта – быў дасведчаны пра дэталі кулуарнай палітыкі, чуйны да атмасферы княжацкага двара і мог выказвацца даволі свабодна. Нават ён у адным з данясенняў Вялікаму магістру тэўтонцаў прызнаў аўтарытэт асобы Вітаўта на міжнароднай арэне: «Ведайце яшчэ, што ў вялікага князя былі і амбасады з Вялікага Ноўгарада, Масквы, Смаленска, і ўвесь час усё прыязджаюць да яго паслы: ад татарскага хана, ад турэцкага султана і ад многіх іншых хрысціянскіх і нехрысціянскіх князёў. Прыязджаюць яны з багатымі падарункамі, – цяжка было б іх усіх апісаць, раскажу пра тое вусна, калі вярнуся» [8].

Паназіраем над выкананнем вялікім князем і яго канцылярыяй прадстаўнічых функцый. Звернемся да вынікаў даследавання гісторыка В. Цішчанкі, які займаўся вывучэннем міжнароднага права. Ён адзначае, што «асноўным відам дзейнасці дыпламатыі ВКЛ былі перамовы». Сярод форм дачыненняў вылучаліся абмен дыпламатычнымі лістамі і граматамі, пасольствамі і непасрэдная сустрэча манархаў [9]. Выбар формы ўзаемаадносін залежаў ад важнасці пытання і ступені дружалюбнасці краіны. Дыпламатычныя зносіны Вітаўт падтрымліваў з Тэўтонскім ордэнам, Інфлянтамі, Заволжскай і Нагайскай Ардой, Крымскім ханствам, Польшчай, Маскоўскай дзяржавай, Цвер'ю, Вялікім Ноўгарадам, Псковам, Валахіяй, Венгрыяй, Чэхіяй [9]. Паколькі сталых паслоў, якія б пастаянна знаходзіліся пры двары вялікага гаспадара, не было, пасольствы мелі статус часовых. Важнай акалічнасцю з'яўлялася тое, што «міжнародныя дагаворы набывалі юрыдычную сілу толькі пасля замацавання іх асабістай прысягай і пячаткай гаспадара», хоць і распрацоўваліся сумесна з дарадцамі [9]. Далей В. Цішчанка працягвае: «На дагаворы паміж Ордэнам і ВКЛ на востраве Салін у кастрычніку 1398 г. разам з пячаткай вялікага князя прысутнічалі і пячаткі яго князёў і баяр у якасці паручыцеляў» [9]. З гэтага вынікае, што ступень даверу да Вітаўта як адзінаўладнага гаранта выканання ўзаемных абавязкаў у міжнародных стасунках была недастатковай.

Пра ўзровень перамоў ускосна сведчылі «почты» – склад місіі. Пры вялікім князю гэта маглі быць давераныя асобы, сваякі, канцылярска-тэхнічная кагорта, а таксама прыставы, мэтай якіх было сачыць, каб удзельнікі перамоў не мелі падазроных кантактаў з мясцовым насельніцтвам, і праваднікі. Князь Вітаўт прызначаў праваднікоў для вандроўкі да меж ВКЛ асабліва важным персонам – у 1421 г. яны былі прадастаўлены Жыльберу дэ Лануа, паслу каралёў Генрыха V і Карла VI, якому «аказаў... вялікую павагу, добра частаваў яго і тры разы заклікаў да сябе на абеды, падчас якіх сажаў... за свой стол. Перад ад'ездам... зрабіў яму вельмі добрыя падарункі: золата, срэбра, шубы, шапкі, тканіны, чашкі, зброя, коні» [10]. Бачым, што абмен падарункамі стаўся дадатковым спосабам прадэманстраваць лаяльнасць, а таксама сцвердзіць уласную магутнасць і ўразіць апанента.

Трэба сказаць, што замежныя крыніцы не заўжды паказваюць князя Вітаўта станоўча. Каштоўныя звесткі пра меркаванне міжнароднай гандлёвай супольнасці аб Вітаўце і паводзінах яго двара можа даць «Зборнік руска-лівонскіх актаў» К. Нап'ерскага, апублікаваны ў 1868 г. Імператарскай акадэміяй навук, каментаваны Д. Жарыным у 2011 г. Некаторую долю надрукаваных дакументаў складаюць тэксты на ніжненямецкім дыялекце сярэдневяковай нямецкай мовы. Д. Жарын прыводзіць пераказ ліста-скаргі эльтэрмана (кіраўніка гільдыі) і абшчыны нямецкіх купцоў у Полацку да Рыжскага магістрата ў 1400 г. з паведамленнем пра тое, што «вялікі князь Вітаўт чыніць у адносінах да нямецкіх купцоў усялякія перашкоды ў гандлі за тое, што яму было адмоўлена ў крэдыце на набыццё тканін». Такім чынам, можна сцвярджаць, што ў асяродку літоўска-нямецкіх гандляроў у Вітаўта, на жаль, склалася адмоўная рэпутацыя [10, с. 19].

Асабліва заўважнай была знешняя атрыбутыка вялікага гаспадара як суб'екта камунікатыўнай дзейнасці. Прэзентацыя яго паўнамоцтваў і статусна-ролевых адзнак праходзіла падчас рытуалаў, дыпламатычных візітаў і перамоў, так званых «выпраў», выступлення баявых харугваў. Таксама гэта адлюстроўвалася ў гарадской і замкавай архітэктуры, у паднашэнні артэфактаў і нашэнні адпаведнага сітуацыі касцюма.

Рытуал каранацыі апісаны ў «Аповесці пра рыцарскія справы і ўчынкі Вітаўта Вялікага»: «Урачыстасць адбывалася ў Віленскім замку ў касцёле святога Станіслава. Віленскі біскуп Андрэй Вазілок усклаў на галаву Вітаўта княскую шапку і адзеў на яго шаты вялікага князя. Вялікі літоўскі марашалак, паводле заведзенага звычаю, даў у рукі Вітаўта агалены меч, жэзл вялікага князя і пячатку Вялікага Княства Літоўскага. Жонку Вітаўта Ганну там жа абвесцілі княгіняй. Літоўскія паны прынеслі прысягу вялікаму князю, выканалі неабходныя абрады» [3, с. 256]. Да згаданых у летапісе сімвалічных адзнак Вітаўтавай улады трэба аднесці яшчэ харугвы і выявы на іх – своеасаблівы лагатып, што пацвярджае прыналежнасць роду. У манаграфіі Л. Спаткая «Нацыянальныя і дзяржаўныя сімвалы Беларусі» ёсць згадкі пра літоўскія харугвы Вітаўта, якія, магчыма, былі фамільнымі. Паводле Я. Длугаша, аўтара хронікі аб Грунвальдскай бітве, войска Вялікага княства складалася з 40 харугваў; 30 мелі сцягі з выявамі «Пагоні». На сцягах астатніх 10 былі выявы «Слупоў» – радавога знака Вітаўта, полацкага варыянта кіеўскага «Трызуба». Магчыма, гэта былі ўласныя харугвы, сфарміраваныя з асабістых уладанняў князя або на яго асабістыя сродкі [11]. Цікава, што на беларускай Вушаччыне засталіся камяні з выявай трызубца, названыя імем Вітаўта. Адзін з іх – «Вітаўтавы відэльцы» – З. Скварчэўскі лічыць верагодным знакам родавага герба Вітаўта «Калюмны», або «Слупы» [4].

Гісторык А. Краўцэвіч удакладняе, што «каранацыя была сакральным дзеяннем... у Вялікім Княстве Літоўскім кароль быў благаслаўлёны Богам, яго ад імя Бога, ад імя рымскага першасвятара мазалі свяшчэнным алеем... Пад спевы князь даваў абеты, паўтараў за святаром: "Шлюбую клапаціцца аб падданых, шлюбую быць справядлівым манархам"» [12]. Пасля каранацыі па ўсёй дзяржаве агалошваліся так званыя «ўніверсалы»: які князь прыняў уладу, якія

прывілеі засталіся за пэўнымі землямі. Ён удакладняе, што гэта традыцыя была ў Полацкай і Віцебскай землях, якія ўвайшлі ў склад ВКЛ у XIV ст.

Вялікім ударам для «паблісіці» літоўскага князя пасля з'езду ў Луцку стала згуба кароны, выпраўленай для яго Жыгімонтам. Яе сімвалічны змест шмат значыў для ўсталявання палітычнага парытэту на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага і памежных земляў.

Пахавальны рытуал таксама падпарадкоўваўся заходнему пратаколу і пацвярджаў статус і высокае паходжанне князя або баярына. Г. Барвенава сцвярджае, што «галоўнай адметнасцю пахавальных комплексаў XI–XIV стст. у храмах на тэрыторыі Беларусі з'яўляецца наяўнасць крыптаў, якія зафіксаваны ў полацкіх храмах. Нідзе больш у Старажытнай Русі крыпты невядомыя. Князёў, членаў іх сем'яў праводзілі на той свет з сімваламі ўлады (залататканыя дыядэмы, аплеччы, пярсцёнкі), у багатым адзенні з прывазных тканін» [13]. Ведаючы, што паводле Вітаўтавага завяшчання пахаванне адбылося ў Віленскім кафедральным касцёле, можам меркаваць, што яно праходзіла ў адпаведнасці са згаданым абрадам.

Пэўнай платформай уздзеяння на грамадскую думку магла стаць выправа 1427 г., калі князь даехаў да ваколіц Масквы, прымаючы па дарозе мясцовых рускіх князёў, якія дэкларавалі яму паслушэнства і адорвалі багатымі падарункамі [6].

У навуковай літаратуры падрабязна апісана візуальная рэпрэзентацыя ўлады – артэфакты, архітэктура княжацкага жытла, касцюм, каларыстыка строяў. Гэтыя атрыбуты дазвалялі даць любому прадстаўніку насельніцтва ВКЛ інфармацыю аб прыступцы, якую займае іх уладальнік на сацыяльнай лесвіцы.

Ажыццяўляць уладныя паўнамоцтвы, надаваць юрыдычную сілу дзяржаўным дакументам дазваляў вядомы артэфакт – маестатная (тронная) пячатка Вітаўта. Яна магла адлюстроўваць абсягі ўладанняў гаспадара, дзяржаўную сімволіку, геральдычныя выявы. Выгляд пячаткі змяняўся ў залежнасці ад камунікатыўнага паслання, якое яна мусіла данесці. Так, на мяжы 1380–90-х гг. з традыцыйнай «Пагоні» гедымінавічаў, размешчанай на пячатцы Вітаўта, знік цмок (адзнака Ягайлы), а на шчыце вершніка замест шасціканцовага крыжа з'явіліся тры «Слупы» – хутчэй за ўсё, стылізаваны герб гедымінавічаў «Калюмны». Так уладар засведчыў свае непадзельныя правы на літоўскі сталец [14].

У першыя гады XV ст., пасля значнага пашырэння тэрыторый ВКЛ, тронная пячатка зноў змяніла выгляд – арыентуючыся на складаныя еўрапейскія гербы, яна змяшчала новы дзяржаўны герб ВКЛ з Пагоняй, Капейшчыкам, Крыжом і Мядзведзем, які, па сутнасці, быў пасланнем памежным краінам аб спрэчных тэрыторыях – Польшчы, што лічыла сваімі Валынскія землі (выява Крыжа), і Тэўтонскаму ордэну, які меў прэтэнзіі на Жамойць (выява Мядзведзя) [14][1].

Манеты, як і гербавыя пячаткі, мусілі адлюстроўваць выявы гедымінавічаў, якія з'яўляліся важкім аргументам на карысць уладных паўнамоцтваў князя. Так, тыя ж «Калюмны» можна сустрэць на пенязях, квартніках да 1390-х гг., а на дырхемах – да 1420-х [14].

Паводле сярэдневяковых законаў мясцовага горада- і замкабудаўніцтва вышынную дамінанту архітэктурнага комплексу павінны былі складаць нежылыя вежы – данжоны, або – ва ўсходняй традыцыі – «слупы», закліканыя стаць сімвалам высокай княжацкай улады. Так, у Крэўскім замку, насуперак распаўсюджанай абарончай архітэктуры тэўтонскага тыпу, была пабудавана Княжацкая вежа. Тую ж магчымасць пазначыць свой статус Вітаўт скарыстаў, калі пры дапамозе крыжацкіх майстроў узвёў шасціпавярховую вежу ў Трокскім замку. Таксама пры Вітаўце быў рэканструяваны Горні замак у Вільні: над ім з'явіліся высокія фланкіруючыя вежы [15].

Багатай крыніцай інфармацыі пра эвалюцыю княжацкай улады і яго зносін з дварамі Еўропы стала даследаванне княжацкага мужчынскага касцюма. Існавала дзве плыні развіцця строя – парадны і штодзённы.

Парадны складаўся з кароткай фалдаванай тунікі, абціслых нагавіцаў, падпяразаных на сцёгнах шырокім поясам, круглага гарнастаевага каўняра, доўгага шырокага плашча-мантыі, кароткіх ботаў-кампагаў з завостранымі насамі (згадаем, што, паводле М. Бачарова, даўжыня носа абутку ў сярэдневяковай Еўропе сведчыла пра знатнасць паходжання ўладальніка, і нават былі дакументальна замацаваны абмежаванні даўжыні для простага і шляхетнага саслоўя). Як і іншыя манархі, Вітаўт насіў цырыманіяльны гатычны строй, пра што сведчаць выявы «Хронікі Бельскага». Г. Барвенава прыводзіць у прыклад лейпцыгскія і кракаўскія пісьмовыя крыніцы XIX ст., дзе крыжацкі пасол Конрад Кібург апісвае выгляд князя Вітаўта: «...на сабе меў жоўты ядвабны кафтан (жупан), зашпілены да самага горла залатымі гузікамі на залатых пятліцах. Сподняя сукня ружовая з татарскай тканіны і чырвоныя скураныя боты з залатымі астрогамі. На кафтане пояс, золатам гафтаваны, з тасьмы, нешырокі, пры якім кручкі для прышпільвання шаблі віселі, зашпілены на багатую спражку. Зверху кафтан цёмна-сіняга колеру, пашыты па-ліцвінску, толькі каротка падрэзаны. З-пад засцежкі кафтана над поясам выглядала рукаяць штылета, камянямі дарагімі высаджаная» [16]. Багацце на дарагія тканіны і металы, адпаведнасць

[1] *Цітоў А.* Сфрагістыка і геральдыка Беларусі. Мінск, 1999.

бургундскай модзе, разнастайнасць паходжання матэрыялаў – сукнаў, аксаміту, ядвабу, франчэ, тафты, атласу, аксаміту, арасу, беленага і нашэнскага палатна, цвіліху, бархану, баваўніцы – замоўленай аздобы, ювелірных вырабаў з Заходняй Еўропы і Азіі, з якіх сфарміраваны касцюм, несумненна паказвалі дасведчанаму наведвальніку, хто перад ім [16].

Штодзённы ўбор не прадугледжваў нашэння рыцарскай зброі і мітры, таму па-за прадстаўнічымі мерапрыемствамі Вітаўт мог дазволіць сабе традыцыйны ліцвінскі касцюм. А. Цітавец піша: «…звычайна ён апранаўся ў кафтан з белага палатна (сукно), паверх якога апранаў верхні кафтан з каўнярком або жупан, пашыты "па-ліцвінску", падпярэзваўся багатым поясам, вышытым золатам з каштоўнай спражкай. Паясным адзеннем служылі ваўняныя штаны, а верхнім – ваўняны плашч, кажух або падшытае мехам адзенне. Абуваў часцей за ўсё чырвоныя скураныя боты з залатой аздобай» [17]. Тут, між іншым, прысутнічала золата-чырвоная каларыстыка, якая дазваляла ідэнтыфікаваць вялікага гаспадара толькі па строі. Я. Дуко дадае, што ў побыце княская эліта насіла «шматварыянтныя капелюшы, берэт, каптуры, а таксама саламяны капялюш (у ім узгадваецца Вітаўт)». Таксама ён прыводзіць звесткі Я. Длугаша, які сцвярджаў, што «ўборам вялікі кн. Вітаўт прысвячаў мала ўвагі, аддаючы перавагу авечаму кажуху, пакрытаму сукном, на які падчас святочных выхадаў накідваў плашч». Гэта акалічнасць можа гаварыць на карысць агульнага вобраза Вітаўта як прадстаўніка мясцовай знаці, які дэманстраваў прыхільнасць да спрадвечнай культуры і традыцый свайго народа.

Выявы жонкі вялікага князя і яго самога сталі вядомы ў 2014 г., калі ў Вільні былі экспанаваны ілюстрацыі пачатку XVI ст. работы нямецкага мастака, выкупленыя з прыватнай калекцыі ў Вялікабрытаніі. Каляровая гама яе адзення ўтрымлівае багата чырвонага і залатога (мантыя, мітра) і адпавядае каларыстыцы касцюма мужа. Таксама, згодна з тагачаснымі еўрапейскімі тэндэнцыямі, кошт касцюма першай жанчыны дзяржавы павінен быў сцвердзіць непарушны аўтарытэт вялікага князя. Таму паказальныя згадкі сучаснікаў вялікай княгіні, якія адшукала Г. Барвенава, пра сустрэчу на Салінскім возеры Вітаўта з вялікай княгіняй Ганнай і Вялікага магістра: «Ганна на піры выйшла ў такім шыкоўным і дарагім строі, што нават бывалыя еўрапейскія госці былі ашаломлены і занатавалі гэтае здарэнне ў сваіх дзённіках» [16].

Аналіз апрацаваных даных і частковая рэканструкцыя шляхоў камунікатыўнага ўздзеяння на грамадскасць падчас княжання Вітаўта даюць падставы падвесці некаторыя вынікі. 1. Інфармацыйна-камунікацыйную дзейнасць князя і княжацкага двара можна лічыць пратаформамі сувязей з грамадскасцю ўмоўна – з той прычыны, што яна ўзнікала спарадычна, незапланавана. 2. Суадноснымі ў параўнанні з сучаснымі практыкамі PR можна лічыць наступныя старажытныя формы сацыяльнай камунікацыі: а) з пункту гледжання надання сацыяльна значнага зместу асобе і дзейнасці Вітаўта – міфалагізацыя вобраза вялікага князя, моцная цэнтралізацыя ўлады, яе «замкнёнасць» на адной асобе, захады па павелічэнні колькасці лаяльных васалаў, часовае патуранне вузкім канфесійным інтарэсам, фарміраванне станоўчага вобраза першай асобы дзяржавы ў летапіснай традыцыі, вітанне, замаўленне панегірычных твораў; б) з пункту гледжання ажыццяўлення дзяржаўнай палітыкі шляхам камунікатыўна-сацыяльных практык – фарміраванне корпуса дарадцаў, выкананне вялікім князем прадстаўнічых функцый; в) з пункту гледжання знешняй атрыбутыкі гаспадарскага двара – адпраўленне рэлігійных рытуалаў каранацыі і пахавання, выкарыстанне іх у грамадскай практыцы, захаванне заходняга дыпламатычнага пратакола, арганізацыя выпраў па падуладнай тэрыторыі, падпарадкаванне дамінантным княжацкім збудаваннем іншай гарадской і замкавай архітэктуры, выкарыстанне геральдычнай каларыстыкі і сімволікі ў вялікакняжацкім касцюме і атрыбутыцы.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Кужелева-Саган И.* Генезис и история паблик рилейшнз. Анализ интерпретаций. Томск, 2004.

2. *Сидельников И.* «Протопиар», или Связи с общественностью в древности [Электронный ресурс] // Проблемы массовой коммуникации на рубеже тысячелетий : материалы Всерос. науч.-практ. конф. (Воронеж, 12–14 мая, 2003 г.). Воронеж, 2003. URL: http://window.edu.ru/catalog/pdf2txt/193/51193/24962?p_page=20 (дата обращения: 29.12.2016).

3. Беларуская літаратура X–XV стст. [Электронны рэсурс] / уклад., прадм., камент., пер. на беларус. і адаптацыя І. Саверчанкі. Мінск, 2010. URL: http://www.bsu.by/Cache/pdf/358053.pdf (дата звароту: 30.12.2016).

4. *Скварчэўскі З.* Вобраз князя Вітаўта ў міфалагічнай свядомасці беларусаў [Электронны рэсурс] // Arche. 2013. 17 крас. URL: http://krytyka.by/by/page/science/sacialnyia-navuki/11399 (дата звароту: 24.12.2016).

5. *Шэлегава К.* Нататкі «Пра Літву» Энэя Сільвія Пікаламіні як крыніца для вывучэння паганскіх культаў балцкага насельніцтва ВКЛ XV ст. [Электронны рэсурс] // Актуальныя праблемы крыніцазнаўства айчыннай гісторыі : матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф. (Віцебск, 6–7 кастр. 2011 г.). Віцебск, 2011. URL: http://ivid.ucoz.ru/upload/library/Vitebsk_2011.pdf (дата звароту: 26.12.2016).

6. *Мікульскі Ю.* Князь Вітаўт вачыма нашых продкаў. Стаўленне рускага насельніцтва ВКЛ да літоўскага гаспадара [Электронны рэсурс] // Беларус. думка. 2012. № 5. С. 93–99. URL: http://beldumka.belta.by/isfiles/000167_995056.pdf (дата звароту: 27.12.2016).

7. *Пятраўскас Р.* Літоўская знаць у канцы XIV–XV ст.: склад – структура – улада / пер. з літ. А. Мікус. Смаленск, 2014.
8. *Черепко В.* Великий князь Витовт [Электронный ресурс] // Rulit. URL: http://www.rulit.me/books/velikij-knyaz-vitovt-read-302039-13.html (дата обращения: 29.12.2016).
9. *Цішчанка В.* Арганізацыя дыпламатычнай службы ў ВКЛ у канцы XIV – пачатку XVI ст. [Электронны рэсурс] // Белорус. журн. междунар. права и междунар. отношений. 2005. № 3. URL: http://evolutio.info/content/view/774/113/ (дата звароту: 29.12.2016).
10 *Жарын Д.* Руска-лівонскія акты, сабраныя К. Е. Нап'ерскім у XIX стагоддзі, як крыніца па гісторыі гандлёвых зносін Ганзы з беларускімі гарадамі ў сярэднія вякі [Электронны рэсурс] // Актуальныя праблемы крыніцазнаўства айчыннай гісторыі : матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф. (Віцебск, 6–7 кастр. 2011 г.). Віцебск, 2011. URL: http://ivid.ucoz.ru/upload/library/Vitebsk_2011.pdf (дата звароту: 26.12.2016).
11. *Спаткай Л.* Нацыянальныя і дзяржаўныя сімвалы Беларусі. Мінск, 2016.
12. *Борисенко К.* «В ВКЛ две партии могли провести разные коронации» / [Интервью с А. Кравцевичем] [Электронный ресурс] // БелГазета. 2011. № 3 (777). 24 янв. URL: http://www.belgazeta.by/ru/2011_01_24/tema_nedeli/22156/_tpl//ru/2011_01_24/tema_nedeli/ (дата обращения: 30.12.2016).
13. *Барвенава Г.* Вывучэнне і ўшанаванне пахаванняў караля, вялікага князя, вышэйшага кліру як важны кампанент станаўлення дзяржавы [Электронны рэсурс] // Трэці міжнародны кангрэс даследчыкаў Беларусі : прац. матэрыялы. 2014. Т. 3. Культура, літаратура і рэлігійныя традыцыі. URL: http://icbs.palityka.org/wp-content/uploads/2014/09/10-01_Barvenava.pdf (дата звароту: 30.12.2016).
14. Эвалюцыя дзяржаўнага герба Вялікага Княства Літоўскага па даных сфрагістыкі і нумізматыкі [Электронны рэсурс] // Library. URL: http://library.by/portalus/modules/belarus/readme.php?subaction=showfull&id=1290716620&archive=1291455490&start_from=&ucat=& (дата звароту: 01.01.2017).
15. *Волкаў М.* Абарончыя храмы ВКЛ: меркаванне аб паходжанні тыпу // Історія релігій в Україні. Науковій щорічнык / рэд. З. Білик. Львів, 2009. Кн. II. С. 385–392.
16. *Барвенава Г.* Гатычны касцюм Вялікага Княства Літоўскага канца XIII – пачатку XVI ст. [Электронны рэсурс] // Бібліятэка гістарычных артыкулаў. 2007. URL: http://jivebelarus.net/culture/gothic-suit-in-vkl.html (дата звароту: 02.01.2016).
17. *Титовец А., Фурсова Е., Тяпкова Т.* Традиционная культура белорусов во времени и пространстве. Минск, 2013.

## References

1. Kuzheleva-Sagan I. Genezis i istoriya pablik rileishnz. Analiz interpretatsii [Genesis and history of PR. An analysis of interpretations]. Tomsk, 2004 (in Russ.).
2. Sidel'nikov I. «Protopiar», ili svyazi s obshchestvennost'yu v drevnosti. *Problemy massovoi kommunikatsii na rubezhe tysyacheletii* : materialy Vseross. nauchn.-prakt. konf. (Voronezh, 12–14 May, 2003). Voronezh, 2003 [Electronic resource]. URL: http://window.edu.ru/catalog/pdf2txt/193/51193/24962?p_page=20 (date of access: 29.12.2016) (in Russ.).
3. Belaruskaja litaratura X–XV stst. Minsk, 2010 [Electronic resource]. URL: http://www.bsu.by/Cache/pdf/358053.pdf (date of access: 30.12.2016) (in Belarus.).
4. Skvarchjewski Z. Vobraz knjazja Vitawta w mifalagichnaj svjadomasci belarusaw [Image of Duke Vytautas in the mythological consciousness of Belarusians]. *Arche*. 2013. 17 apr. [Electronic resource]. URL: http://news.arche.by/by/page/science/sacialnyia-navuki/11399 (date of access: 24.12.2016) (in Belarus.).
5. Shjelegava K. Natatki «Pra Litvu» Jenjeja Sil'vija Pikalamini jak krynica dlja vyvuchjennja paganskih kul'taw balckaga nasel'nictva VKL XV st. *Aktual'nyja prablemy krynicaznawstva ajchynnaj gistoryi* : matjeryjaly Mizhnarodnaj navuk.-praktychnaj kanferencyi (Vicebsk, 6–7 Oct., 2011). Vicebsk, 2011 [Electronic resource]. URL: http://ivid.ucoz.ru/upload/library/Vitebsk_2011.pdf (date of access: 26.12.2016) (in Belarus.).
6. Mikul'ki Ju. Knjaz' Vitawt vachyma nashyh prodkaw. Stawlenne ruskaga nasel'nictva VKL da litowskaga gaspadara [Duke Vytautas by the eyes of our ancestors. The attitude of the Russian population Grand Duchy of Lithuania to Lithuanian owner]. *Belarus. dumka*. 2012. No. 5. P. 93–99 [Electronic resource]. URL: http://beldumka.belta.by/isfiles/000167_995056.pdf (date of access: 27.12.2016) (in Belarus.).
7. Pjatrawskas R. Litowskaja znac' u kancy XIV–XV st.: sklad – struktura – ulada [Lithuanian nobility at the end of XIV–XV c.: Composition – structure – authority]. Smalensk, 2014 (in Belarus.)
8. Cherepko V. Velikii knyaz' Vitovt. *Rulit* [Electronic resource]. URL: http://www.rulit.me/books/velikij-knyaz-vitovt-read-302039-13.html (date of access: 29.12.2016) (in Russ.).
9. Cishchanka V. Arganizacyja dyplamatychnaj sluzhby w VKL u kancy XIV – pachatku XVI st. [Diplomatic service Grand Duchy of Lithuania end of XIV – beginning XVI c.]. *Belorus. zhurnal mezhdunarodnogo prava i mezhdunarodnykh otnoshenii*. 2005. No. 3 [Electronic resource]. URL: http://evolutio.info/content/view/774/113/ (date of access: 29.12.2016) (in Belarus.).
10. Zharyn D. Ruska-livonskija akty, sabranyja K. E. Nap'erskim u XIX stagoddzi, jak krynica pa gistoryi gandljovyh znosin Ganzy z belaruskimi garadami w sjarjednija vjaki [Russian-Livonian acts collected by K. E. Napierski in the XIX century as a source for the history of trade communication with Belarusian cities in the Middle Ages]. *Aktual'nyja prablemy krynicaznawstva ajchynnaj gistoryi :* matjeryjaly Mizhnarodnaj navuk.-praktychnaj kanferencyi (Vicebsk, 6–7 Oct., 2011). Vicebsk, 2011. [Electronic resource]. URL: http://ivid.ucoz.ru/upload/library/Vitebsk_2011.pdf (date of access: 26.12.2016) (in Belarus.).
11. Spatkaj L. Nacyjanal'nyja I dzjarzhawnyja simvaly Belarusi. Minsk, 2016 (in Belarus.).
12. Borisenko K. «V VKL dve partii mogli provesti raznye koronatsii». [Interv'yu s A. Kravtsevichem]. *BelGazeta*. 2011. No. 3 (777). 24 January [Electronic resource]. URL: http://www.belgazeta.by/ru/2011_01_24/tema_nedeli/22156/_tpl//ru/2011_01_24/tema_nedeli/ (date of access: 30.12.2016) (in Russ.).
13. Barvenava G. Vyvuchjenne i wshanavanne pahavannjaw karalja, vjalikaga knjazja, vyshjejshaga kliru jak vazhny kampanent stanawlennja dzjarzhavy [Study and worship of king graves, the great prince, the highest clergy as an important

component of the formation of the state]. *Trjeci mizhnarodny kangrjes dasledchykaw Belarusi : pracownyja matjeryjaly*. 2014. Vol. 3. Kul'tura, litaratura i rjeligijnyja tradycyi. [Electronic resource]. URL: http://icbs.palityka.org/wp-content/uploads/2014/09/10-01_Barvenava.pdf (date of access: 30.12.2016) (in Belarus.).

14. Jevaljucyja dzjarzhawnaga gerba Vjalikaga knjastva Litowskaga pa dadzenyh sfragistyki i numizmatyki. *Library* [Electronic resource]. URL: http://library.by/portalus/modules/belarus/readme.php?subaction=showfull&id=1290716620&archive=1291455490&start_from=&ucat=& (date of access: 01.01.2017) (in Belarus.).

15. Volkaw M. Abaronchyja hramy VKL: merkavanne ab pahodzhanni typa. *Istorija religij v Ukraïni. Navukovij щorichnyk*. L'viv, 2009. Book II. P. 385–392 (in Ukrainian).

16. Barvenava G. Gatychny kascjum Vjalikaga Knjastva Litowskaga kanca XIII – pachatku XVI st. [Gothic costume of the Grand Duchy of Lithuania]. *Biblijatjeka gistar. artykulaw*. 2007. [Electronic resource]. URL: http://jivebelarus.net/culture/gothic-suit-in-vkl.html (date of access: 02.01.2016) (in Belarus.).

17. Titovets A., Fursova E., Tyapkova T. Traditsionnaya kul'tura belorusov vo vremeni i prostranstve [Traditional culture of the Belarusians across time and space]. Minsk, 2013 (in Russ.).

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 17.12.2016.*
*Received by editorial board 17.12.2016.*